

МАНІФЕСТ КУПАЛАЎСКАГА ТЭАТРА 9

ПАДЗЯЛІЦЬ КАСПІЙ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЖНІЎНЯ 2018 г. СУБОТА № 158 (28774)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Віталь ГРЫЦЭВІЧ, намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«Прапануецца абмеркаваць увядзенне ў Беларусі інстытута абавязковай сертыфікацыі суб'ектаў турдзейнасці. Зараз яна добраахвотная: у рэестр суб'ектаў турдзейнасці падаюцца звесткі, што працаваць у сферы турызму збіраюцца асобныя арганізацыі, ІП, якія не маюць да гэтай сферы ніякага дачынення, а займаюцца зусім іншай дзейнасцю. І ў Мінспорце задаюцца пытаннем, як у такім выпадку будуць абаронены правы турыста. Пакуль канчатковае рашэнне не прынята, увядзенне абавязковай сертыфікацыі яшчэ будзе абмяркоўвацца з зацікаўленымі дзяржорганамі і турбізнесам».*

# СВЯТЫ ЗАСТУПНІК МАЛОЙ РАДЗІМЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Шэсце, якое штогод 16 жніўня ладзіцца ў невялікай вёсцы Кавальцы, што ў Дзяржынскім раёне, чымсьці нагадвае рэлігійныя працэсіі Лацінскай Амерыкі. Толькі замест статуі святога тут над галовамі людзей лунае яго выява, напісаная на вялікім абразе. Святы Рох — у каталіцкай традыцыі заступнік ад эпідэмічных хвароб, тут ужо стаў сваім, асабліва шануемым, мясцовым. Тут ужо няважна, якую веру ты спавядаеш і ці спавядаеш наогул — калі ты маеш дачыненне да гэтай вёскі, калі вырас тут, калі прывозіш сюды на лета сваіх унукаў, ты павінен пакланіцца святому апекуну, папрасіць у яго заступніцтва для вёскі, ят нешматлікіх сёння жыхароў і іх нашчадкаў, якія разляцеліся па ўсім свеце...**

СТАР. 5

## КОРАТКА

• «Мінскэнерга» ў студзені — ліпені выявіла амаль 4,2 тысячы фактаў крадзяжу электраэнергіі.

• **Новы часовы паверанны ў справах ЗША ў Беларусі Джэніфер Мур прыбыла ў Мінск.**

• Сярэднявечная шахматная фігура знойдзена падчас раскопак у Старым замку ў Гродне 16 жніўня. Фігура, хутчэй за ўсё, пешка, зробленая з рога. Папярэдне знаходку датуюць XIV стагоддзем.



• **Бясплатная электрычка давязе ў Мінск балельшчыкаў БАТЭ пасля матча плэй-оф Лігі чэмпіёнаў з галандскім ПСВ.**

• Параалімпіец Ігар Бокі заваяваў чацвёрты залаты медаль на чэмпіянаце Еўропы па плаванні ў Дубліне (Ірландыя).

ISSN 1990 - 763X

■ Хутка ў школу

## «У пінжаку адчуваю сябе крутым коўчам»

### Выбіраем форму разам з вучнямі

**Штогод «Беллегпрам» выпускае да навучальнага года сотні мадэляў адзення. Але ці лёгка з гэтага асартыменту выбраць штосьці па душы? Ацаніць форму мы запрасілі самых строгіх суддзяў — саміх школьнікаў. Разам мы прагуляліся па ЦУМе, пакапаліся сярод вешалак і падлічылі, колькі грошай спатрэбіцца на экіпіроўку, у якой не сорамна будзе паказацца перад аднакласнікамі.**

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

■ За кадрам



## ЗАДАЧКА СА МНОГІМІ ВЯДОМЫМІ

### У Белтэлерадыёкампаніі прайшоў кастынг вядучых для дзіцячага «Еўрабачання»

**Ужо праз тры месяцы Мінск прыме 16-ы міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2018», які яшчэ не пачаўся, а ўжо стаў рэкордным па колькасці ўдзельнікаў, у тым ліку краін-дэбютантаў. Белтэлерадыёкампанія працягвае маштабную падрыхтоўку да шоу: у прыватнасці, днямі ў медыяхолдынгу адбылося «жывое» праслухоўванне кандыдатаў у вядучыя творчага форуму.**

Арганізатары атрымалі больш як 100 заявак ад дзяцей ва ўзросце 9—14 гадоў і дарослых, прычым не толькі з Беларусі, але і з Украіны, і нават з ЗША. Пасля папярэдняга адбору да наступнага этапу былі допушчаны крыху больш як 30 найлепшых. Прэтэндэнтам трэба было прадэманстраваць не толькі бездакорную работу з англамоўным сцэнарыем, але і ўменне трымацца перад камерамі, імправізаваць, працаваць у тандэме.

— Насамрэч на дадзены момант я не магу ўпэўнена сказаць, каго мы шукаем: дваіх вядучых ці траіх, хлопца і дзяўчыну ці двух хлопцаў, больш дарослых ці падлеткаў. Напэўна, павінны супасці некалькі крытэрыяў: і добрая англійская мова, і прывабная знешнасць, і харызма, энергетыка, але ніводны з іх сам па сабе не з'яўляецца вырашальным, — прызнаўся яшчэ да пачатку кастынгу **старшыня Белтэлерадыёкампаніі і кіраўнік аргкамітэта дзіцячага «Еўрабачання-2019» Іван ЭЙСМАНТ.** — Таму пошукі працягваюцца, і калі заўтра з'явяцца яшчэ новыя цікавыя кандыдатуры, то мы абавязкова іх разгледзім.

СТАР. 11

# УРОК НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЧЫНОЎНІКАЎ

## На нарадзе ў Прэзідэнта кіраўніку дзяржавы прадставілі кандыдатуры на пасады ва ўрадзе і ў сувязі з заменай іншых службовых асоб

**Нагадаем, што па выніках наведвання Оршы 13—14 жніўня Аляксандр Лукашэнка ўказаў на сістэмныя недапрацоўкі па комплексным развіцці раёна і ў сувязі з гэтым прыняў шэраг кадравых рашэнняў: ад пасад былі вызвалены міністры прамысловасці і будаўніцтва, а таксама старшыня Аршанскага райвыканкама. Тады ж кіраўнік дзяржавы запатрабаваў да канца тыдня ўнесці яму прапановы па кадравых зменах ва ўрадзе.**

На працягу трох сутак Адміністрацыя Прэзідэнта разам з кіраўнікамі парламента і старшынёй Камітэта дзяржкантролю працавалі над складаннем адпаведнага спіса кандыдатур. «Я ведаю, што былі праведзеныя кансультацыі і з грамадскімі арганізацыямі, і з іншымі, думаю, што я таксама паслухаю іх меркаванне перад тым як назначаць новых членаў урада і іншых службовых асоб», — сказаў Прэзідэнт у пачатку нарады.

На абмеркаванне былі запрошаны таксама старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый Вакульчык і начальнік Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Андрэй Паўлючэнка, ведамствы якіх кантралююць антыкарупцыйны склад нік службовых асоб кадравага рэестра Прэзідэнта. «Калі ў іх ёсць нейкія пытанні па кандыдатурах, якія будуць абмяркоўвацца, натуральна, яны іх выкажуць», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што спектр кандыдатур дастаткова шырокі. «У сувязі з тым, што ў нас ёсць неблагія пасы, якія атрымалі пэўны вопыт работы, і вельмі нават добрыя кандыдатуры з ліку дыпламатычнага корпуса, паслухаем меркаванне і міністра замежных спраў у частцы прадстаўленых кандыдатур з дыпламатычнага корпуса», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што кадравае пытанне трэба вырашаць неадкладна, каб не дапусціць некантралюемага развіцця некаторых негатыўных працэсаў у эканоміцы, ды і з пазітыўных каб не звалілася. «Хоць я не хачу тут драматызаваць сітуацыю: міністры на месцах, ведамствы працуюць, губернатары на месцы, кіруемасць у нас проста не можа быць згубленая», — дадаў ён.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на грамадскую думку адносна нядаўна прынятых рашэнняў. «Я адсочваю сродкі масавай інфармацыі, там асобныя ў інтэрнэце заявы, я іх чую, я іх бачу, і я пастараюся ў найбліжэйшы час на іх адрэагаваць. ...Я задаволены ўжо тым, што працэнтаў на 90 гэта пазітыўныя водгукі, гэта кажа пра тое, што людзі, падтрымліваючы Прэзідэнта ў яго дзеяннях, намякаюць на тое, што дысцыпліну трэба падымаць у нашых радах. І гэта будзе зроблена неадкладна», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

Лідар краіны зрабіў акцэнт на тым, што ў сітуацыі, якая склалася ў Оршы, вінаваты не толькі чыноўнікі. Кожны чалавек, перш чым некага асуджаць, павінен паглядзець на сябе. «Пад напругай павінны быць пастаўлены ўсе: ад нелюбімых чыноўнікаў (яны гэтага заслугоўваюць, людзі тут маюць рацыю), людзям трэба паглядзець і на сябе: «а які я?», перш, чым некага асуджаць, «ці ўсё я зрабіў?» У Оршы, па-мойму, з гэтым у нас ёсць праблемы, як і па ўсёй краіне. Таму я загадаў, пакуль мы там з балота будзем вылазіць і выводзіць на нармальны ўзровень развіцця прадпрыемствы і сацыяльную структуру, увесці асаблівы рэжым кіравання ў Аршанскім рэгіёне. Гэта значыць, кожны, ад простага чалавека, павінен быць напружаны гэтак жа, як кіраўнікі прадпрыемстваў і структуры адпаведнай улады. Людзі павінны адчуваць, што там пачалася, вобразна кажучы, рэвалюцыя і варушыцца трэба ўсім, у тым ліку простым людзям».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Бяспека

# У Мінску папярэдзілі ўгон паветранага карабля

## падчас камп'ютарных каманднa-штабных вучэнняў

**У Беларусі на базе аўтаматызаванага дапаможнага пункта кіравання ВПС і войскаў ППА прайшло сумеснае камп'ютарнае каманднa-штабное вучэнне аб'яднанай сістэмы проціпаветранай абароны дзяржаў — удзельніц СНД «Рэгіянальная бяспека — 2018».**

— Падчас практычнага этапу вучэнняў мы адпрацавалі такія сітуацыі, якія найбольш часта могуць сустрэцца, — расказаў **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі Ігар ГОЛУБ.** — Першая — угон паветранага судна тэрарыстамі. Таксама мы праверылі алгарытм дзеянняў падчас парушэння дзяржаўнай мяжы баявым паветраным суднам. Трэці эпізод — з-за форс-мажорных абставін яно згубіла візуальную арыенціроўку. У тым выпадку, калі лётчык і экіпаж не могуць сарыентавацца, дзе яны знаходзяцца, то дзяжурныя сілы па проціпаветранай абароне павінны прыйсці ім на дапамогу. У гэтай сітуацыі мы ажыццяўляем перахоп. Што гэта такое? Мы падводзім паветранае судна-перахватчыка да таго, якое страціла арыенціроўку, пасля чаго і выводзім яго на зададзены маршрут. Калі камандзір экіпажа дакладвае аб тым, што арыенціроўка адноўлена, то мы лічым, што задача выканана.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ТРАМП ПАЗБАВІЎ ЭКС-КІРАЎНІКА ЦРУ ДОСТУПУ ДА САКРЭТНЫХ ДАНЫХ



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп адклікаў доступ да сакрэтнай інфармацыі ў экс-кіраўніка ЦРУ Джона Брэнана. Гэта адбылося на наступны дзень пасля таго, як былы цэрэўшнік чарговы раз раскрытыкаваў паводзіны кіраўніка Белага дома ў Twitter, назваўшы яго «пагрозай для нацыі» і чалавекам, які не адпавядае «мінімальным стандартам прыстойнасці, ветлівасці і сумленнасці». Апаненты Трампа асцерагаюцца, што Брэнан паплаціўся за падобныя словы і ўслед за ім доступу да сакрэтных даных пазбавяцца яшчэ некалькі крытыкаў цяперашняй адміністрацыі.

Брэнан узначальваў ЦРУ з 2013 да 2017 года, а да гэтага быў галоўным саветнікам прэзідэнта Барака Абамы па пытаннях барацьбы з тэрарызмам. Ён пакінуў свой пост 20 студзеня 2017 года — у дзень інаўгурацыі Трампа. З таго часу Брэнан стаў адным з самых лютых крытыкаў 45-га прэзідэнта: у прыватнасці, ён фактычна абвінаваціў Трампа ў здрадзе і заявіў, што на саміце ў Хельсінкі кіраўнік Белага дома знаходзіўся пад кантролем прэзідэнта Расіі. Часам выпады экс-дырэктара былі даволі жорсткія: «Вы для палітыкі — тое ж самае, што Берні Мэдаф (стваральнік адной з найбуйнейшых фінансавых пірамід у гісторыі Злучаных Штатаў. — **Заўв. ТАСС**) для рынку каштоўных папер».

### ЗША НЕЗАДАВОЛЕНЫ УКРАІНАЙ З-ЗА ПАСТАВАК КІТАЮ РУХАВІКОЎ ДЛЯ БАЯВЫХ САМАЛЁТАЎ

Амерыканскія эксперты раскрытыкавалі рашэнне ўкраінскай кампаніі «Матор Січ» пастаўляць Кітаю рухавікі для вучэбна-баявых самалётаў JL-10 на суму ў $380 млн. Пра гэта паведаміла газета The Washington Times.

Як яна нагадала, у 2016 годзе «Матор Січ» заключыла дагавор на пастаўку 250 такіх рухавікоў, аднак на сёння іх пастаўлена толькі 20. Пры гэтым мяркуецца, што на згаданых самалётах будзе адпрацоўвацца, у прыватнасці, пасадка на авіяносцы, чаго раней Кітай ажыццяўляць не мог. Для абаронна-прамысловага комплексу Кітая рухавікі для самалётаў з'яўляюцца адным са слабых месцаў, таму іх Пекін закупляе ў Расіі і Украіны. У Вашынгтоне ўжо знайшлося нямала крытыкаў такіх дзеянняў Кіева. Як мяркуе экс-саветнік камітэта Сената ЗША па замежных справах і эксперт па Кітаю Уільям Трыплет, тым самым Украіна дапамагае кітайскай ваеннай галіне развівацца хутчэй. «Фактычна, украінцы з аднаго боку атрымліваюць грошы амерыканскіх падаткаплацельшчыкаў, але ў той жа час наносяць удар у спіну амерыканскаму флоту», — сцвярджаў Трыплет. Пры гэтым ён заявіў, што ЗША відавочна не хочуць, каб кітайцы «паскоранымі тэмпамі вучыліся саджаць знішчальнікі на авіяносцы».

### У АЎСТРЫІ РАСКРЫТЫКАВАЛІ ЗАПРАШЭННЕ ПУЦІНА НА ВЯСЕЛЛЕ КІРАЎНІКА МЗС

У Аўстрыі крытыкуюць запрашэнне прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна на вяселле кіраўніка аўстрыйскага знешнепалітычнага ведамства Карын Кнайсль. Як заявіў агенцтву АРА аўстрыйскі палітолаг Герхард Мангот, маючы адбыцца візіт «узбуджае падазрэнне» ў тым, што Аўстрыя з'яўляецца «траянскім канём», які прадстаўляе інтарэсы Расіі ў ЕС, а Пуцін атрымлівае магчымасць абвергнуць рэпутацыю Расіі як ізаляванай дзяржавы.

Для забеспячэння бяспекі расійскага прэзідэнта ў федэральнай зямлі Штырыя будуць задзейнічаны некалькі сотняў паліцэйскіх і супрацоўнікаў падраздзялення спецыяльнага прызначэння «Кобра». Прадстаўнік упраўлення паліцыі Штырыі Франц Грундніс растлумачыў падобныя меры законам аб паліцыі і абавязацельствамі ў адпаведнасці з міжнародным правам. Паводле яго слоў, гэтыя выдаткі пакрые міністэрства ўнутраных спраў. Пры гэтым аўстрыйскія СМІ нагадваюць, што візіт Пуціна ў Вену два месяцы таму абышоўся аўстрыйскім падаткаплацельшчыкам у 423 тысячы еўра.

■ На тэму дня

# КАБ АДПАЧЫНАК НЕ БЫЎ САПСАВАНЫ

**Далёка не па ўсіх напрамках вылятаць з суседніх краін турыстам выгадней, чым з Беларусі. Такое меркаванне выказаў старшыня Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі (РСТ) Піліп ГУЛЫ падчас круглага стала «Што і чаму трэба мяняць у сферы турызму» ў прэс-цэнтры БелТА.**



«Сённяшняя сітуацыя на рынку цэн абсалютна іншая, чым яшчэ некалькі гадоў таму. Ёсць шэраг напрамкаў, па якіх з Беларусі ляцець значна больш выгадна. Думаю, што з часам гэтая сітуацыя выраўняецца, — мяркуе эксперт. — Мы маем намер зрабіць падрабязны аналіз палётных праграм у Беларусі і ў суседніх краінах. Ён пакажа рэальную сітуацыю. Думаю, у кастрычніку мы зможам прадставіць гэтую аналітыку».

Міністэрства спорту і турызму гатова падключыцца да гэтай работы і падзяліцца данымі, якія для гэтага неабходныя. «Гэта будзе карысна ўсім», — лічыць намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Мінспорту Віталь Грыцэвіч.

Піліп Гулы падкрэсліў, што турысты, якія выбіраюць танныя палётныя праграмы замежных бюджэтных авіякампаній, не заўсёды разумеюць, што гэта звязана з пэўнымі рызыкамі. Яскравы прыклад — нядаўняя сітуацыя, калі беларускія турысты не маглі вылецець на адпачынак з Кіева з-за адмены рэйсаў авіякампаніямі BravoAirways і AndaAir.

«Трэба акумуляваць гэты рынак у сябе ў краіне. І ў нацыянальнай авіякампаніі, і ў нацыянальнага турбізнесу ёсць жаданне і магчымасці зрабіць так, каб ад нас было вылятаць выгадней і танней», — перакананы старшыня РСТ

■ Зробім

# ЦЁЦЯ МОЦЯ ІДЗЕ НА ДАПАМОГУ

## Як праз інтэрнэт-гульню вырашыць праблемы ў сваім раёне

**У сеціве запусцілі гульню «Добрыя суседзі», у якой мясцовым супольнасцям прапануюць паляпшаць гарады і вёскі, дзе яны жывуць. Людзі змогуць аб'ядноўвацца з аднадумцамі, навучыцца складаць план дзеянняў, узаемадзейнічаць з органамі ўлады і нарэшце вырашаць праблемы, якія хвалююць іх двор — ад паламанай дзіцячай пляцоўкі да адсутнасці ліпавай алеі пад вокнамі.**

Удзел у гульні бясплатны (знайсці яе можна на сайце dobrososedi.tilda.ws). Цягнецца яна шэсць тыдняў. Першы — азнаямленчы: трэба будзе наладзіць камунікацыю з тымі, хто жыве побач. Другі — даследчы: выяўляем праблемы. Трэці — рашучы: разбіраемся, куды звяртацца па дапамогу і што можна зрабіць. Чацвёрты — экалагічны: падчас яго паспрабуйце вырашыць пытанні з азеляненнем і асобным зборам смецця. Пяты — забаўляльны: час арганізаваць свята вуліцы, фестываль вёскі ці дваровае чаяванне. Шосты, заключны, тыдзень — публічны: неабходна будзе расказаць пра свае поспехі навакольным.

Кожны аўторак віртуальны дапаможнік — Цёця Моця — будзе прысылаць па тры заданні. Выконваць усе неабавязкова — можна выбраць адно, якое вам падаецца найбольш актуальным і пасільным. Але, калі справіцеся і з іншымі, атрымаеце дадатковыя бонусы.

Каб прайсці гульню, трэба паспець выканаць па адным заданні з кожнага этапу. Самых актыўных запросяць на прэмію «Зробім», але, бадай, галоўны прыз — змены да лепшага ў вашым двары.

Арганізатар праекта — Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацыі. Галоўная задача гульні — натхніць людзей, даць ім першы імпульс і падказкі, неабходныя для вырашэння мясцовых праблем.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Футбол

# ХТОСЬЦІ ПРАХОДЗІЦЬ, ХТОСЬЦІ СЫХОДЗІЦЬ

## Усе беларускія клубы згулялі свае матчы ў топ-турнірах

**Футбалісты барысаўскага БАТЭ выйшлі ў плэй-оф Лігі чэмпіёнаў, перамогшы па суме дзвюх сустрэч азербайджанскі «Карабах». Цяпер у барацьбе за выхад у групавы этап турніру барысаўчане сустрэнуцца з галандскім ПСВ з Эйндховена. Першая сустрэча адбудзецца 21 жніўня ў Барысаве, у адказ — 28 жніўня ў Эйндховене. Адзначым, што такім чынам футбалісты БАТЭ ўжо забяспечылі сабе месца ў групавой стадыі Лігі Еўропы.**



А вось прадстаўнікі брэсцкага і мінскага «Дынама» завяршылі свае выступленні ў Лізе Еўропы. Брастаўчане па суме дзвюх сустрэч саступілі кіпрскаму «Апалону» (пасля буйнога гасцявога паражэння 0:4 на сваім полі дынамаўцы выйгралі 1:0). У барацьбе за выхад у групавы этап Лігі Еўропы футбалісты «Апалона» двойчы сустрэнуцца з нарвежскім «Мольдэ».

Мінчане не змаглі ўтрымаць вялікую перавагу над піцерскім «Зенітам» у 4 мячы і саступілі ў гасцях — 1:8 (у дадатковы час). Наступным сапернікам футбалістаў з Піцера будзе швейцарскі «Базель».

Такім чынам, мінскае «Дынама» атрымае ад УЕФА за цяперашні еўракубкавы сезон 780 тысяч еўра. «Шахцёр», які завяршыў выступленне ў Лізе Еўропы раўндам раней, зарабіў 500 тысяч еўра. Брэсцкае «Дынама», якое прапускала першы кваліфікацыйны раўнд, атрымае 540 тысяч еўра. БАТЭ ўжо забяспечыў сабе мінімум 7,92 мільёна еўра. Калі барысаўчане саступяць у раўндзе плэй-оф ПСВ, то атрымаюць 5 млн еўра. Плюс 2,92 мільёна еўра — за пападанне ў групу Лігі Еўропы. А вось перамога над ПСВ прынясе БАТЭ 15,25 мільёна еўра. Да таго ж у канцы сезона барысаўскі клуб зможа разлічваць на выплаты з маркетынгавага пула.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Карысны адпачынак

# НАД ДАХАМІ СТАРОГА ГОРАДА

## Самая вялікая ў Беларусі назіральная пляцоўка адкрылася ў Гродне

**З першага дня пляцоўка стала папулярнай у гродзенцаў і гасцей горада. Многія падняліся на вышыню, каб палюбавацца цэнтральнай часткай старога Гродна, зрабіць фотасесію ці пасядзець у летнім кафэ.**



Пляцоўка знаходзіцца на даху былога ўнівермага, а цяпер гандлёвага дома «Нёман», што ў цэнтры Гродна. Усе ахвотныя могуць падняцца на вышыню 25 метраў на панарамным ліфце альбо па лесвіцы.

У гандлёвым доме расказалі, што плошча новага аб'екта складае 800 квадратных метраў. Гэта самая вялікая назіральная пляцоўка ў Беларусі. Яна падзелена на зону адпачынку — лаўнж-кафэ на 100 месцаў — і тэрыторыю для праменаду. Трэба сказаць, што Гродна адзіны абласны цэнтр, дзе адкрыта кафэ на даху, такой устанавай можа пахваліцца толькі Мінск. А вось сталы сапраўды эксклюзіўныя. Стальніцы зроблены са старога паркету яшчэ савецкіх часоў. Як высветлілася, ён захоўваўся доўгі час у кабінетах універмага. Новае жыццё старому матэрыялу далі майстры з Санкт-Пецярбурга.



Пляцоўка ў цэнтры Гродна атрымала назву «Дахі старога горада» і будзе адкрыта для ўсіх наведвальнікаў кожны дзень да позняга вечара.

Убачыць стары горад зверху можна будзе не толькі летам, але і ў любую пару года. У халоднае надвор'е наведвальнікам прапануюць цёплыя пледы, а вось кафэ зімой працаваць не будзе. Назіраць за жыццём горада можна, седзячы на зручных лаўках, да якіх прыладжаны невялічкія столікі. Таксама можна ўтульна размясціцца ў плецёных крэслах. Аб'ект мае ўсе падставы, каб стаць новай візітоўкай горада.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

■ Здарэнне

# КАНЯ ВЫЦЯГНУЛІ З САЛОНА

## Сутыкненне рэйсавага аўтобуса Neoplan з жывёлай адбылося ў Жлобінскім раёне.



У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС паведамілі, што ў дзве гадзіны ночы ратавальнікам Жлобінскага раённага падраздзялення паведамілі пра дарожна-транспартнае здарэнне на трасе М-5 каля вёскі Завад. У момант сутыкнення ў аўтобусе знаходзіліся 29 пасажыраў і два кіроўцы: яны пакінулі салон аўтобуса самастойна да прыбыцця падраздзяленняў МНС. Ніхто з людзей не пацярпеў. Спецыялісты пры дапамозе адмысловага абсталявання выцягнулі цела загінулай жывёлы, якая, разбіўшы лабавое шкло транспартнага сродку, апынулася ў салоне. У 03.30 прыбыў аўтобус той жа фірмы, які далей дастаўляў пасажыраў да месца, куды яны накіроўваліся.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# КАБ ЧЫТАЦЬ І ПІСАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Маё сяброўства са «Звяздой» пачалося гадоў сорак таму. Не скажу, што яно было пастаяннае: доўгі час я выпісваў расійскія газеты «Известия», «Правду», «Труд», а «Звязду» перыядычна купляў у кіёсках, каб праверыць сваё веданне беларускай мовы.**

Маёй газетай, выданнем нумар адзін, яна стала ў 1992-м і галоўным чынам з-за таго, што друкуецца па-беларуску. З цікавасцю чытаю артыкулы пра падзеі ў краіне і за межамі, на тэмы здароўя, культуры, вядзення хатняй гаспадаркі. Сярод любімых — рубрыкі «Неасабісты суб'ектыў» Алены Ляўковіч, «Нефармат» Святланы Яскевіч, «Жыццёвінкі» Уладзіміра Пернікава, дадатак «Сямейная газета»...

Кожную пятніцу газета друкуе падборкі «вясёлых і праўдзівых гісторый...» Дасылаць іх (хай не вельмі складныя) можа любы чытач... Бывáліцу, «калі ў ёй нешта ёсць», у рэдакцыі «адшліфуюць». Гэта я ведаю па сабе, бо не адзін раз і пісаў, і друкаваўся... У тым ліку — у сваёй самай любімай рубрыцы «Хто каго?», дзе трэба прыдумваць подпіс да смешнага здымка. Іх за 16 гадоў існавання конкурсу было шмат. А ўжо колькі вершаў!.. Многія дагэтуль у памяці.

Якія пажаданні рэдакцыі? У грамадстве шмат розных праблем, шмат недахопаў. Таму, на мой погляд, газета павінна быць больш прынцыповай, больш баявой. Не для таго, каб пазласловіць — «во, як тут дрэнна», — а каб да лепшага выпраўляць становішча.

Яшчэ мне хацелася б больш інфармацыі ў выпусках «Што ў свеце робіцца», больш спорту і, можа, здароўя. А калі здаровіцца, то і работа робіцца.

**Мікалай Старых,**

*г. Гомель*

■ Крымінал

# Стральба ў Івацэвіцкім раёне: загінуў міліцыянер

**Трагічнае здарэнне адбылося ўчора ў вёсцы Бабровічы Целяханскага сельсавета Івацэвіцкага раёна. Мясцовы мужчына часта паводзіў сябе неадэкватна і агрэсіўна. Паводле інфармацыі праваахоўнікаў, у магла быць незарэгістраваная паляўнічая стрэльба. У пятніцу, каля 12 гадзін дня, калі ўчастковы з памочнікам у рамках мерапрыемстваў па праверцы законнасці захоўвання зброі ў насельніцтва з'явіліся ў двары дома, мужчына без папярэджання, раптам, адкрыў агонь па міліцыянерах на паражэнне.**

«Следча-аператыўная група знаходзіцца на месцы здарэння ў Івацэвіцкім раёне, дзе ў адным з двароў вёскі Бабровічы быў забіты ўчастковы інспектар міліцыі 1976 года нараджэння, яшчэ адзін, 1995 года нараджэння, — паранены і ў цяперашні час шпіталізаваны. Па папярэдніх звестках, 57-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Бабровічы, калі да яго прыйшлі ўчастковыя, адкрыў агонь па супрацоўніках праваахоўных органаў», — праінфармавалі БелТА ў Следчым камітэце.

Вясковец забарыкадаваўся дома, адмаўляўся здацца і пагражаў працягам стральбы. Супрацоўнікі АМАПа змаглі абясшкодзіць стралка. Ён затрыманы. Зараз з ім працуюць супрацоўнікі следча-аператыўнай групы.

На месцы спецаперацыі працавала кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў, Следчага камітэта, следча-аператыўная група.

# Дырэктар-хабарнік

## Да трох гадоў калоніі за хабар прыгавораны экс-дырэктар аднаго з мінскіх ЖЭУ

**Супрацоўнікі сталічнай міліцыі затрымалі дырэктара па месцы працы з доказамі злачынства. Ён атрымаў хабар ад прадстаўніка камерцыйнай структуры Мінска за спрыяльнае вырашэнне пытання аб заключэнні дагавора пастаўкі электраабсталявання, падпісанне рахунка-пратакола і своечасовую аплату па дагаворы.**

Суд прыгаварыў былога дырэктара да трох гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Адбываць пакаранне ён будзе ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Таксама фігурант пазбаўлены права займаць пэўныя пасады.

**Сяргей КУЛАКОЎ**





# «У пінжаку адчуваю сябе крутым коўчам»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Знаёмцеся: нашы эксперты **Анастасія ЖАБКО** і **Ягор СВІРСКІ.** Насці 12 гадоў, у верасні пойдзе ў сёмы клас мінскай гімназіі № 16. З маленства дзяўчынка займаецца музыкай і ўжо паспела заявіць пра сябе на буйных конкурсах. Летась была фіналісткай нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне», сёлета выйшла ў паўфінал. А ў 2016-м заняла першае месца ў дзіцячым конкурсе на «Славянскім базары ў Віцебску».

У Насцінай гімназіі дзейнічае адзіная форма: для сямікласніц гэта сінія спадніца і камізэлька з эмблемай навучальнай установы. Але дзяўчынка прызнаецца, што ходзіць у гэтым не кожны дзень.

— Мне падабаецца стыль 50—60-х гадоў мінулага стагоддзя. Адзенне той эпохі вельмі жаноцкае, падкрэслівае талію і хавае недахопы фігуры, — дзеліцца школьніца. — Нядаўна вырашыла пакапацца ў маміных рэчах, якія яна насіла ў студэнцтве. Знайшла некалькі цікавых. Напрыклад, чорную сукенку па калена з залатымі гузікамі і каўнерыкам. Вельмі элегантная — не хапае толькі капялюшыка для вобраза.

Насця аддае перавагу цёмным рэчам — чорным, сінім. У яе гардэробе ёсць і штаны, і блузкі, і пінжакі, і сукенкі. «Люблю насіць усё, каб не паўтарацца», — усміхаецца.

На яе думку, ідэальная школьная форма — гэта зручная класіка, нічога яркага і кідкага. На шопінг дзяўчынка звычайна ходзіць з мамай: парада збоку ніколі не лішняя.

16-гадовы Ягор — адзінаццацікласнік сталічнай школы № 38. Ён стваральнік Hype Quiz — інтэлектуальнай гульні, дзе каманды падлеткаў адказваюць на пытанні. Карацей, бізнесмен-пачатковец. І стэндапер. У яго школе да адзення вучняў ставяцца строга.

— Нас правяраюць: каб не было красовак, джынсаў. Кепка — ні ў якім разе. Могуць адправіць дадому пераадзявацца, — кажа Ягор. — Я хаджу ў школу ў звычайных штанах — не чорных і не са стрэлкамі — і ў кашулі: нашу яе навыпуск.

Увогуле хлопцу падабаецца стыль хіп-хоп. Кашулі па-за межамі школы адзявае вельмі рэдка, можа, тры разы на год. «Напэўна, проста надакучвае насіць іх падчас вучобы», — заўважае.

— Мне здаецца, усе павінны хадзіць у тым, у чым ім камфортна, каб думалі пра вучобу, а не пра знешні выгляд, — дзеліцца Ягор сваімі развагамі наконт школьнага адзення. — Хоць нейкія правілы павінны быць, але не занадта строгія.

Ідзём шукаць форму для Насці. Першае, на што падае позірк дзяўчынкі, — цёмная сукенка з белымі манжэтамі і каўнерыкам. Каштуе такая каля 89 рублёў. А манжэты і каўнерык, як высветлілася, адшпільваюцца — вельмі зручна для мыцця.

Сярод кашуль Насця разглядае светлыя, з дробным няяркім прынтам. Варыянты з нашыўкамі, модныя ў гэтым сезоне, пакідае без увагі: усё ж такі мінімалізм ёй бліжэйшы. «Можа, ружовую?» — прапануе кансультант. Дзяўчынка круціць галавой: не яе колер.



— А вось гэты жакет мне падабаецца, — паказвае Насця белую элегантную мадэль. Рэч, між іншым, дызайнерская, на цэнніку — 106 рублёў.

Да кашулі падбіраем штаны і ідзём у прымерачную. Штаны ад гродзенскага прадпрыемства за 60 рублёў мы ў выніку «забракавалі»: тканіна занадта аблягае. Затое бавоўняная кашуля, пашытая мазырскай фабрыкай, — самае тое. Каштуе такая 43 рублі.

Кіруемся да секцыі абутку. Насця кажа, што хацела б сабе паўчаравікі на невялікім абцасе — чатыры-пяць сантыметраў. У выніку нагледзелі некалькі мадэляў: бардовыя чаравікі са штучнай скуры (60 рублёў), цёмна-сінія лоферы (102 рублі, натуральная скура) і чорныя лоферы на тоўстай падэшве (64 рублі). «Апошнія больш за ўсё падабаюцца, — каментуе школьніца і кажа, што яе «падкупіла» аксамітная ўстаўка на абутку: — Цікавае спалучэнне матэрыялаў».

З Ягорам спачатку выбіраем рукзак. Старшакласнік разглядае мадэлі без малюнкаў. Знаходзіць класны варыянт: карычневы са скуранымі ўстаўкамі. Праўда, такі не кожныя бацькі купяць: на цэнніку амаль 366 рублёў. А вось шэра-сіні з тканіны, які такса ма спадабаўся Ягору, абыдзецца ў 42 рублі.

— Раней было прышпільна насіць сумкі цераз плячо, а зараз не. Паясныя сумкі модныя, але з такой будзе заўважна, што прыйшоў без падручнікаў, — жартуе хлопец.

Пакуль ідзём да вешалак з адзеннем, ён расказвае, што касцюмы не носіць. «Я вельмі высокі (192 сантыметры) і худы. Мне ўсё кароткае. Не шыюць на такіх, як я», — тлумачыць.

З памерам для Ягора сапраўды няпроста. Доўга блукаем сярод кашуль. Аднатонныя хлопец не надта любіць, белыя — наогул «адмятае». Выбірае адну мадэль у дробную блакітную клетачку. У прынцыпе, дастаткова: кашулямі да новага навучальнага года хлопец ужо закупіўся. Ажно чатырма: сіняй у клетку, сіне-белай у лінейку, у рознакаляровую клетку і белай з чырвоным арнаментам.

З усіх штаноў змаглі выбраць толькі адны. У іншых то рост быў не той, то колер падводзіў. «Нейк сумна, — каментуе Ягор. — Мне падабаюцца завужаныя штаны — у прамых я падобны да саліста савецкага ансамбля. *(Усміхаецца.)*

На адной з вешалак старшакласнік заўважае ярка-чырвоны бомбер. «Я б такі замест пінжака насіў», — гаворыць. Але ў школу можна толькі пінжак. Хлопец, ацаніўшы поглядам асартымент, заўважае: мадэлі нядрэнныя. Выбірае пінжак у цёмную клетачку.

Прымяраем увесь камплект (у суме кашуля, штаны і пінжак абышліся б у 278 рублёў). Выглядае стыльна. Ягор кажа, што ў школу хадзіў бы без пінжака — з ім занадта парадна. Хоць сама рэч спадабалася. «У мяне такой ніколі не было, адчуваю сябе крутым коўчам. Па пінжак, магчыма, вярнуся».

Што маем у выніку? Падабраць стыльную форму ад айчынных вытворцаў — задача выканальная. Іншае пытанне — ці ўдасца ўпісацца ў бюджэт. Нагадаем, што, па падліках Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, на экіпіроўку для старшакласніка можа пайсці да 900 рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

■ Наўздагон

# Чаму ўцёк тыгравы пітон?

## Мінпрыроды ўстанаўлівае абставіны здарэння з гэтай змяёй у сталіцы

**Нагадаем, што 15 жніўня ў Мінску на вуліцы Убарэвіча быў адлоўлены тыгравы пітон, якога напачатку змясцілі на часовае ўтрыманне ў Мінскі заапарк, а потым вярнулі гаспадару. З гэтай нагоды Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выступіла з наступнай інфармацыяй.**

«Мінпрыроды аператыўна праведзены маніторынг наяўных у грамадзян у г. Мінску афіцыйна зарэгістраваных тыгравых пітонаў. У цяперашні час дзікая жывёла знойдзена і перададзена прадстаўнікамі Мінскага заапарка грамадзяніну, які заявіў на яе правы.

Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўстанаўліваюцца падрабязнасці абставін здарэння, у тым ліку асоба грамадзяніна, падрыхтавана позва аб выкліку яго ў камітэт для дачы тлумачэння.



У выпадку пацвярджэння законнасці валодання грамадзянінам названай дзікай жывёлы ў дачыненні да яго будзе пачаты адміністрацыйны працэс па артыкуле 15.32 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях за нясвоечасовую рэгістрацыю дзікай жывёлы і за парушэнні ўмоў утрымання.

Звяртаем увагу, што ўладальнікі дзікіх жывёл павінны забяспечыць умовы ўтрымання, якія адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь ад 27 лютага 2007 года № 16.

Умовы ўтрымання жывёл уключаюць не толькі ўстанаўленне адпаведнасці колькасных паказчыкаў (плошча, вышыня, глыбіня памяшканняў), але і ўстанаўленне адпаведнасці ўмоў, якія забяспечваюць біялагічныя, відавыя, фізіялагічныя і індывідуальныя патрэбы дзікіх жывёл і якія выключаюць самаадвольны выхад дзікіх жывёл з месцаў іх утрымання.

Нагадваем, што, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, утрыманне і (або) развядзенне ў няволі незарэгістраваных дзікіх жывёл, якія падлягаюць рэгістрацыі, забараняюцца.

Рэгістрацыі падлягаюць дзікія жывёлы, якія змяшчаюцца і (або) разведзеныя ў няволі (уключаючы іх нашчадкаў, якія дасягнулі ўзросту трох месяцаў):

якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, альбо з'яўляюцца ўзорамі CITES;

адлоў якіх у мэтах утрымання і (або) развядзення ў няволі ажыццяўляецца на падставе дазволу на адабранне дзікіх жывёл з асяроддзя іх жыхарства.

Уладальнікі дзікіх жывёл абавязаны на працягу аднаго месяца з дня адлову або набыцця гэтых жывёл звярнуцца ў дзяржаўны орган, які ажыццяўляе рэгістрацыю такіх жывёл, па рэгістрацыю.

У выпадку выяўлення дзікай жывёлы з прыкметамі захворвання, ранення або траўмавання не спрабуйце самастойна аказаць ёй дапамогу. Паведаміце пра такі выпадак у аператыўна-дзяжурную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў або ў дзяжурную службу раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


HOME CREDIT

**Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Хоум Кредит»**

Республика Беларусь,
220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129.
Тел.: (8017) 229 89 91,
**www.homecredit.by**

**УВАЖАЕМЫЕ КЛИЕНТЫ!**

В соответствии со статьей 56 Гражданского кодекса Республики Беларусь и статьей 23 Закона Республики Беларусь от 09.12.1992 № 2020-XII «О хозяйственных обществах» уведомляем Вас, что 12.07.2018 единственным акционером ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «Хоум Кредит», компанией с ограниченной ответственностью ABH BELARUS LIMITED, принято решение о проведении реорганизации ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «Хоум Кредит» в форме присоединения к Закрытому акционерному обществу «Альфа-Банк». Соответствующее решение ЗАО «Альфа-Банк» о реорганизации в форме присоединения к банку ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «Хоум Кредит» принято 23.07.2018.

Лицензия на осуществление банковской деятельности №18, выданная НБ РБ 15 июля 2016 года. УНП 807000056.

# СВЯТЫ ЗАСТУПНІК МАЛОЙ РАДЗІМЫ







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

За ўвесь час свайго існавання — а гэта, калі легенду аб яго з'яўленні пакласці на канкрэтныя гістарычныя рэаліі, не менш за паўтары сотні гадоў — абраз ні разу не пакідаў вёску. Падчас эпідэміі халеры яго заказала і прывезла аж з Варшавы мясцовая пані Свідава, абраз абнеслі вакол вёскі — і страшная хвароба яе абмінула. З таго часу 16 жніўня гэта ахоўнае кола робяць вакол Кавальцоў штогод. Розныя былі часы, розныя былі людзі. Здаралася, забаранялі шэсце, спрабавалі разганяць з міліцыяй. У страшныя 1930-я асабліва заўзятыя атэісты нават стралялі ў абраз — і сёння на сцягне святога Роха побач з ранай намаляванай — раны сапраўдныя — дзіркі ад куль. А людзі працягвалі верыць і шанаваць, перадавалі абраз з хаты ў хату, калі разбурылі капліцу, дзе ён стаяў... Выпадкова ці не — але вёску заўсёды мінаюць многія беды, што коцяцца па наваколлі. Лічыцца: пакуль святы Рох «дома» — нічога дрэннага тут здарыцца не павінна.

Сталых жыхароў зараз у вёсцы чалавек дваццаць набярэцца ў лепшым выпадку. Але ўлетку вяртаюцца да родных хат маладыя гарадскія пенсіянеры, прыязжаюць на канікулы ўнукі-праўнукі. Некаторыя на мясцовае свята спецыяльна бяруць адпачынак ці выхадны. Сустракаюць святога Роха сем'і амаль ля кожнай хаты, цалуюць абраз, падлазяць пад яго, далучаюцца да працэсіі. І ў канцы шляху за абразом ужо ідзе ўся вёска, і няважна ў той момант, што для кагосьці яна месца жыхарства, а для кагосьці — толькі месца нараджэння.

У гэты дзень яна для ўсіх прысутных — РАДЗІМА. І кожны моліцца яе святому заступніку, каб ён яе збярог і захаваў на гэтай зямлі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ,**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**
**Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by**







# ПРАЦАЎНІКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Да Дня беларускага пісьменства, які сёлета пройдзе на Брэстчыне, у Іванаве, Выдавецкі дом «Звязда» выпусціў адмысловы зборнік нарысаў і гутарак — «Людзі Янаўскага краю».**

Рэдактар раённай газеты «Янаўскі край» Ігар Гетман расказвае пра сваіх землякоў, пра ўраджэнцаў Іванаўшчыны, ураджэнцаў і працаўнікоў Іванава — старажытнага Янава. З многіх матэрыялаў, якія ў большасці сваёй друкаваліся ў мясцовай раённай газеце, паўстае партрэт рэгіёна, багатага на добрыя здзяйсненні.

З уступным словам да кнігі выступае старшыня Іванаўскага райвыканкама Юрый Бісун. Ён працуе кіраўніком раёна больш за дзесяць гадоў. Вось што, у прыватнасці, зазначае Юрый Бісун: «Маёй малой радзімай з'яўляецца ўкраінскае Закарпацце, а калі быць больш дакладным, — горад Хуст. Але вось ужо 12 гадоў як я кірую Іванаўскім раёнам. За гэты час я зросся з ім сваёй душой, ён стаў мне не менш родны, чым той край, дзе я нарадзіўся». І яшчэ з прадмовы да кнігі: «Героі кнігі — людзі, якія маюць прамое дачыненне да захавання нашага краю як рэгіёна культуры і духоўнасці. А ўсе мы проста абавязаны захоўваць такім край, дзе нарадзіўся і пахаваны Напалеон Орда, дзе жылі продкі Дастаеўскага, дзе пачыналася беларускае прадпрымальніцтва, непарыўна звязанае з мецэнацтвам, якое развівалі Скірмунты...»




Гартаючы старонкі выдання, мы сустракаемся з міністрам спорту Сяргеем Кавальчуком (нарадзіўся ў вёсцы Глінна), доктарам навук, членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, славутым аграрнікам Аляксеем Скакуном (выхадзец з іванаўскага Дастоева), протаіерэем Уладзімірам Кавалевічам, доктарам гістарычных навук Пятром Брыгадзіным (ён родам з Моладава), пісьменнікам і журналістам Васілём Жушмам (нарадзіўся ў вёсцы Хамічава), журналістам, празаікам Анатолем Крэйдзічам, кіраўнікамі сельгаспрадпрыемстваў, настаўнікамі, работнікамі іншых сфер. Канешне ж, кніга стане ўсім ім добрым падарункам да Дня беларускага пісьменства, але яшчэ і праз іх выразныя, вартыя прыкладаў лёсы раскажа ў Год малой радзімы пра ўнікальны і багаты на гісторыю Іванаўскі, Янаўскі край.

**Сяргей ШЫЧКО**

# Пра беларускую культуру ў Азербайджане ведаюць

**У папулярных выданнях Азербайджана — «525 газета» і «Літературная газета» — надрукаваны вялікі нарыс азербайджанскага пісьменніка пра беларускага мастака.**

Празаік і публіцыст Камран Назірлі расказвае пра беларускага мастака азербайджанскага паходжання Каміля Камала, дзеліцца сваімі развагамі аб сустрэчы ў яго майстэрні. Варта нагадаць, што Каміль Камал — з тых мастакоў, што працуюць у цесным сяброўстве з творцамі іншых прафесій. Адпаведная і ўвага з боку мастакоў слова. Пра Каміля Камала пісалі паэты і празаікі Рыгор Барадулін, Кірыл Зеляны, Уладзімір Сцяпан, Цімур Зульфікараў, Навум Гальпяровіч, Юлія Алейчанка, Мікола Мятліцкі... Нарыс Камрана Назірлі, між іншым, называецца: «Голас маўчання, альбо Пра Маляўнічы свет грамадзяніна і мастака Азербайджана і Беларусі азербайджанца Каміля Камала». Аўтар акцэнтуе ўвагу на ўсходніх матывах у творчасці мінскага жывапісца, графіка, скульптара.

Што да самога Камрана Назірлі, то ён не аднойчы гасцяваў у Беларусі, удзельнічаў у сустрэчах беларускіх і замежных пісьменнікаў, якія традыцыйна праходзяць у Мінску ў лютым і верасні і ладзяцца пад эгідай Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Саюза пісьменнікаў Беларусі, пры самым актыўным удзеле Выдавецкага дома «Звязда». Як празаік азербайджанскі творца выступаў з апавяданнем у перакладзе на беларускую мову ў газеце «Літаратура і мастацтва». У Мінску рыхтуецца да друку кніга Камрана Назірлі. Выйдзе яна, безумоўна, на беларускай мове.

Дзякуючы намаганням азербайджанскага літаратара, у Баку надрукаваны кнігі пісьменнікаў з Беларусі Мікалая Чаргінца, Анатоля Матвіенкі. У перыядычным друку змешчаны і перакладзеныя Камранам Назірлі творы іншых беларускіх празаікаў. Сярод яшчэ ненадрукаваных прац — і пераўвасобленая на азербайджанскую мову аповесць лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар». Адметна, што і сваіх калег Камран Назірлі прыцягвае да супрацоўніцтва з беларускім бокам. З яго падказкі ў апошнія гады некалькі разоў выступала ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы доктар філалагічных навук з Баку Ірада Мусаева — з рэцэнзіямі, артыкуламі не толькі пра сучасную азербайджанскую літаратуру, але і пра творчасць Святланы Алексіевіч, Алены Брава.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года ПТО для ремонта легковых автомобилей, принадлежащего ОАО «Пуховичинефтепродукт»

Лот № 1. Право заключения договора аренды Объекта: 1. ПТО для ремонта легковых автомобилей с инв. № 602/С-13982. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Октябрьская, 60/1. Площадь, сдаваемая в аренду – 159,9 кв. м. 2. Асфальтобетонное покрытие (прилегающее к зданию с инв. № 602/С-13982 территория) с инв. № 2612 согласно инвентарной карточки учета объекта основных средств. Площадь, сдаваемая в аренду – 232,00 кв. м.

**Начальная цена продажи, с учетом НДС 20 % – 1 578,38 бел. руб. Сумма задатка – 157,84 бел. руб. Шаг аукциона: 5 %. Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта: за здание с инвентарным номером 602/С-13982 – 0,24 базовых арендных величин, в т. ч. НДС 20 % за 1 кв. м; за асфальтобетонное покрытие – 0,1 базовых арендных величин, в т. ч. НДС 20 % за 1 кв. м**

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость, приобретенного на аукционе лота в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола аукциона на основании счета-фактуры.

3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

4. Целевое назначение – Организация пункта технического обслуживания по ремонту и техническому обслуживанию легковых автомобилей.

5. Одновременно с договором аренды Объекта подлежит заключению договор аренды оборудования. Перечень сдаваемого в аренду оборудования: установка для зарядки аккумуляторов SL 600, компрессор, сварочный углекислого газа, подъемник для легковых автомобилей, шиномонтажный станок, балансировочный станок, тест-система СКО 1М, 2 верстака слесарных с тисками, станок БОСТ-38. Сумма ежемесячной арендной платы за оборудование – 128,63 (сто двадцать восемь белорусских рублей 63 копейки), в т. ч. НДС 20 %.

6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина с 01.04.2018 равна 16 руб. 11 коп.

Цена продажи Лота не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, составляет 1 000,00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 18.09.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды имущества (Лот № 1), принадлежащего ОАО «Пуховичинефтепродукт», проводимом 18 сентября 2018 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7.

Окончание приема заявлений 14.09.2018 в 11.00. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Норик Егор Борисович, тел. +375-17-13-35-9-58

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ОАО «ПРОМИНВЕСТ» (местонахождение: 220015, г. Минск, ул. Я. Мавра, дом 33А, комн. 1) извещает о проведении повторного внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 4 сентября 2018 года в 17.00 по адресу: г. Минск, Логойский тракт, 31, магазин «Хозтовары-Мебель».

Собрание проводится в очной форме по решению наблюдательного совета от 18 августа 2018 года на основании его собственной инициативы.

Регистрация участников с 16.00 до 16.50. Для регистрации участнику необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

Дата формирования реестра акционеров: 18 августа 2018 года.

**Повестка дня:**

1. Об избрании счетной комиссии ОАО «ПРОМИНВЕСТ».
2. Об увеличении уставного фонда ОАО «ПРОМИНВЕСТ» путем эмиссии акций дополнительного выпуска, размещаемых путем проведения закрытой подписки.

Ознакомление с документами собрания осуществляется 30.08.2018 – 03.09.2018 г. в рабочее время по месту нахождения общества.

УНП 100646457

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Автокомбинат № 6», 220029, г. Минск, пер. Физкультурный,22 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение – г. Минск, пер. Физкультурный, д. 22**

| № лот | Инв. № | Наименование | Начальная цена бел. руб с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 11105 | Автомобиль Skoda Octavia (рег. знак 9977 AI-7), 2013 г. в. | 18 912,00 | 945,60 |
| 2 | 10766 | Автомобиль ГАЗ (рег. знак КН 1014), 1991 г. в. | 840,00 | 42,00 |
| 3 | 11400 | Автомобиль ГАЗ 31105 (рег. знак 9948 ЕХ-7), 2007 г. в. | 1 020,00 | 51,00 |
| 4 | 30856 | Автомобиль ЗИЛ 4415 10-130 В1 (рег. знак КН 1516), 1991 г. в. | 588,00 | 29,40 |
| 5 | 10847 | Автомобиль ЗИЛ 431610 (138А) (рег.знак АЕ 9497-7), 1989 г. в. | 480,00 | 24,00 |
| 6 | 30074 | Автомобиль ЗИЛ ММЗ 45085 (рег. знак 8760 КЕ), 1999 г. в. | 2 040,00 | 102,00 |
| 7 | 10030 | Автомобиль MAZ 5516 A5-371 (рег. знак AI 1859-7), 2009 г. в. | 6 900,00 | 345,00 |
| 8 | 10261 | Автомобиль МАЗ 551605-272-024Р (рег. знак АЕ 5743-7), 2008 г. в. | 8 640,00 | 432,00 |
| 9 | 10308 | Автомобиль МАЗ 551605-272-024Р (рег. знак АЕ 5746-7), 2008 г. в. | 8 640,00 | 432,00 |
| 10 | 10316 | Автомобиль МАЗ 551605-272-024Р (рег. знак АЕ 5747-7), 2008 г. в. | 8 640,00 | 432,00 |
| 11 | 10359 | Автомобиль МАЗ 5516 А5 (рег. знак АЕ 8384-7), 2008 г. в. | 8 640,00 | 432,00 |
| 12 | 120084 | Полуприцеп МАЗ 975830 3012 (рег. знак 5012 КА), 2004 г. в. | 1 800,00 | 90,00 |
| 13 | 130877 | Полуприцеп ПП 8Б (рег. знак 0732 МА), 1988 г. в. | 780,00 | 39,00 |
| 14 | 130851 | Полуприцеп ПП 8ПС (рег. знак 2235 МА), 1991 г. в. | 396,00 | 19,80 |
| 15 | 10502 | Автомобиль Ural 375 A (рег. знак AI 6575-7), 1981 г. в. | 5 880,00 | 294,00 |
| 16 | 21599 | Станок расточной 670 ГАРО, 1973 г. | 1 260,00 | 63,00 |
| 17 | 10219 | Автомобиль MAZ 551605 271 (рег. знак AI 5034-7), 2009 г. в. | 13 824,00 | 691,20 |
| 18 | 10367 | Автомобиль MAZ 5516 A5 (рег. знак АМ 6732-7), 2008 г. в. | 19 296,00 | 964,80 |
| 19 | 21696 | Станок вертикально-сверлильный 2Б125, 1999 г. в. | 796,80 | 39,84 |
| 20 | 21998 | Молот (кузнечный) М-4132А, 1989 г.в. | 3 072,00 | 153,60 |
| 21 | 99208 | Нагреватель Ariston, модель – SGHP 80 V, 2012 г. | 105,60 | 5,28 |
| 22 | 23100 | Колонка топливо-раздаточная НАРА 28-16, 2007 г. | 758,40 | 37,92 |
| **Месторасположение – Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков** | | | | |
| 23 | 99214 | Котел пищевой электрический КПЭС-100, 2013 г. | 1 440,00 | 72,00 |
| 24 | 99212 | Котел пищевой электрический КПЭС-150, 2013 г. | 1 500,00 | 75,00 |
| 25 | 99213 | Котел пищевой электрический КПЭС-60/5, 2013 г. | 720,00 | 36,00 |

**Порядок ознакомления:** Ознакомление заинтересованных лиц с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Валюкевич Владимир Аркадьевич, контактный телефон, тел. +37529 623 22 96

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов. Покупатель дополнительно оплачивает Продавцу стоимость публикации извещения и стоимость независимой оценки предмета аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 23.06.2018 г.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 06.09.2018** в 10.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by).** Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени, для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае не прохождения регистрации, участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации, участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 04.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж Тел: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона – Лот №1**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования и иного имущества, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Гродненская 55Д/1

| Наименование | Назначение | Общ. пл., кв. м | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Склад-навес** | Сооружение специализированное складов, хранилищ | 265,4 | 100/С-45882 |
| Составные части и принадлежности: два покрытия, ограждение, ворота | | | |
| **Производственное здание** | Здание специализированное иного назначения | 554,5 | 100/С-45884 |
| Составные части и принадлежности: покрытие, эстакада, рампа, три ограждения, ворота, калитка | | | |

С перечнем иного имущества, входящего в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Обременения: частичная аренда. Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок общ. пл. 1,8159 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы |

**Начальная цена с НДС 20 %: 147 598,48 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона: 7 379,92 белорусских рублей BYN**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.30, перерыв с 12.30 до 12.45. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, начальник производственного участка, тел. 80296592523.

**Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Гурского, 16а**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 2 | 827 | Подмости передвижные электрические ППЭ-1, 2010 г. в. | 2 688,00 | 134,40 |

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон: +375-29-654-92-93

**Транспорт и оборудование, расположенные по адресу:** г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а, в составе:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3 | 720 | Печь прокалочная ЭПС -10/400СЭ | 23,76 | 1,19 |
| 4 | 850 | Выпрямитель для дуговой сварки ВДМ-6303С-УЗ | 93,60 | 4,68 |
| 5 | 801 | Трансформатор сварочный ТДМ 252У2 | 22,56 | 1,13 |
| 6 | 611 | Сварочный агрегат колесный (САК), заводской № 13859 | 172,80 | 8,64 |
| 7 | 838 | Автомобиль GAZ-3110, 2003 г. в. | 496,80 | 24,84 |
| 8 | 557 | Установка ПЕНА | 65,76 | 3,29 |
| 9 | 835 | Трансформатор сварочный ТДМ-252У2 | 33,84 | 1,69 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.30, перерыв с 12.30 до 12.45. Ответственные лица: Марчик Петр Иванович, начальник производственного участка СУ-110, тел. :+37529-821-07-71, Соломов Лев Михайлович, мастер производственного участка, тел. 8033-686-66-94

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано в газете «Звязда» 25.07.2018 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **04.09.2018** в 15.00 по адресу**: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **31.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 225885911601000050 площадью 0,1497 га по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Сиротинский с/с, д. Филиппенки, ул. Дачная, 31Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Филиппенское); охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В; придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог. **Нач. цена**: 868,26 бел. руб. **Задаток:** 86,83 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY56AKBB36003310850020000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Сиротинский сельсовет) |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 225881519101000028 площадью 0,2178 га по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Ковляковский с/с, д. Улазовичи, 18А, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (река Западная Двина). **Нач. цена**: 1 306,80 бел. руб. **Задаток:** 130,68 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка**: р/с BY60AKBB36003310250040000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Ковляковский сельсовет) |

**Дата, время и место проведения аукциона:** 18.09.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 20.08.2018 с 8.30 по 17.09.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь)

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; после получения разрешения на строительство объекта снять плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его на благоустройство участка; обратиться в Шумилинский райисполком об изменении видов земель предоставленного зем. участка по мере изменения фактического состояния и характера использования земель для внесения в установленном порядке в государственный зем. кадастр сведений о изменении видов земель. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

# РЭАКЦЫЯ ПАЙШЛА...

## ЯК АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА ЗААХВОЧВАЕ ДА ВУЧОБЫ?

**«У доме прарвала дзве трубы: з халоднай вадой і гарачай. З халоднай у кватэру выліваецца 70 літраў ледзяной вады ў хвіліну, а з гарачай — 12 літраў у секунду. Патонуць жыхары гэтай кватэры ў ледзяной вадзе ці «зварацца»?**

Як вы думаеце, калі б такое пытанне задалі школьнікам на ўроку па матэматыцы, ці падалася б тэма «Адзінкі вымярэння» ім такой ужо сумнай? Уменне педагога фармуляваць пытанні, якія чапляюць вучняў на кручок і ўтрымліваюць іх увагу ўвесь урок, можна параўнаць з сапраўдным мастацтвам. Закідаць пытаннямі прасцей, куды больш складана трапіць у цэль...

### У СУСВЕТНЫМ ТРЭНДЗЕ

Гэтым летам у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі прайшоў ужо другі фестываль актыўнай ацэнкі, які сабраў каля ста педагогаў з усёй Беларусі — ідэйных прыхільнікаў гэтай тэхналогіі навучання. Цікава, што на дыстанцыйны курс «Стратэгіі актыўнай ацэнкі», які вось ужо шэсць гадоў праводзіць Таварыства беларускай школы, заявак заўсёды паступае больш, чым могуць задаволіць арганізатары. Некаторыя выпускнікі курса прызнаюцца, што ім удалося трапіць на вучобу толькі з трэцяй спробы. Але, паднабраўшыся досведу, многія пазней ужо самі становяцца ментарамі на курсе. Да руху педагогаў, якія пажадалі перагледзець свае метады навучання, далучаюцца ўсё новыя энтузіясты. Адбываецца сапраўдная ланцуговая рэакцыя. Сёлета, напрыклад, пасведчанні аб заканчэнні курса атрымалі 72 педагогі, якія на працягу шасці месяцаў крок за крокам спасцігалі новую філасофію і ўводзілі ў сваю практыку элементы актыўнай ацэнкі.

— У Еўропе гэта тэхналогія вядомая пад назвай **Formative Assessment** (дынамічнае ці фарміруючае ацэньванне). Калі ў 2009 годзе ў Беларусь прыехалі настаўнікі з Варшавы, каб падзяліцца сваім досведам, мы зразумелі, што існуе цэлая сістэма, элементамі якой мы раней карысталіся, але рабілі гэта не сістэмна, а эпізадычна, — кажа **прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Мікалай ЗАПРУДСКІ.** — У нас сфарміравалася свая група трэнераў і паўстала пытанне, як назваць гэту сістэму. Вырашылі, што ў Беларусі будзе **актыўная ацэнка (АА).** Таварыствам беларускай школы быў створаны адмысловы сайт www.aacenka.by, дзе арганізаваны дыстанцыйныя курсы. У краіне тры гады працавалі 13 інавацыйных пляцовак па ўкараненні актыўнай ацэнкі ў адукацыйны працэс. Каардынацыя іх дзейнасці ажыццяўлялася цэнтрам прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Многімі настаўнікамі быў абаронены вопыт прымянення АА, на падставе якога яны атрымалі катэгорыю «настаўнік-метадыст». Праводзіцца мноства семінараў, трэнінгаў, урокаў для дарослых, майстар-класаў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і рэгіянальных інстытутах развіцця адукацыі. Што мы маем сёння, праз дзевяць гадоў? Калі настаўнікі ўмела прымяняюць актыўную ацэнку, то ў іх вучняў павышаюцца матывацыя, адказнасць за навучанне і, адпаведна, якасць адукацыі.

Эфектыўнасць такога ацэньвання пацвярджаецца не толькі вопытам настаўнікаў, але і навукай. Ёсць вельмі грунтоўныя даследаванні аўстралійскага прафесара Джона Хэці, вучоных з Адкрытага ўніверсітэта Вялікабрытаніі, якія даказваюць, што FA — мадэль навучання, якая дае вялікі адукацыйны эфект. Яна прызнаная самым эфектыўным сродкам навучання.

**«Ключавым пытаннем можа быць задача, загадка, гіпотэза, любы прадмет, малюнак, фота, калаж, плакат, відэаролік, лайфхак».**




Наталля ЯРМАК: «Ключавым пытаннем можа быць і фатаграфія, і карцінка...»

«Але, на жаль, прысутнічае і прафанацыя, ёсць прыклады няўмелага прымянення актыўнай ацэнкі, вульгарызацыі ідэі, нерэфлексіўнага выкарыстання знешне прывабных сродкаў тэхналогіі АА, — канстатуе Мікалай Запрудскі. — Таму я лічу, што **толькі прафесіяналізм абароніць актыўную ацэнку...»**

### ТАНЦУЕМ ВАКОЛ АДЗНАК

Ці можна навучыць таго, каму нецікава? Ці можа нізкі бал матываваць да навучання? Гэтыя пытанні нельга назваць рытарычнымі. Вучыцца — азначае для многіх атрымліваць адзнакі. Ацаніць працу вучня — значыць абавязкова паставіць яму адзнаку.

Актыўная ж ацэнка прынцыпова пазбягае канкурэнцыі. Настаўнікі, якія яе выкарыстоўваюць, перакананыя, што кожны вучань можа дасягнуць многага, і робіць акцэнт на яго поспехах без параўнання з іншымі вучнямі.

Усё навучанне ў межах актыўнай ацэнкі пранізана зваротнай сувяззю: ад настаўніка да вучня, ад настаўніка да бацькоў, ад вучня да другога вучня, ад вучня да бацькоў. Менавіта каментарый ад настаўніка (вусны і пісьмовы), а не адзнака ў балах, з'яўляецца фундаментам актыўнай ацэнкі. Для педагогаў гэта магчымасць вярнуць у адукацыйны працэс найбольш слабых вучняў, бо дзецям нецікава, калі ў класе адбываецца разбор толькі найбольш тыповых памылак. Кожны хоча чуць найперш пра сябе — пра свае поспехі і няўдачы.

— Чаму дзеці часта баяцца адказваць на ўроку? Таму што баяцца негатыўнай рэакцыі на сваю памылку, — разважае **настаўнік беларускай мовы і літаратуры Міхалішкаўскай сярэдняй школы Наталля ЯРМАК.** — Я лічу, што любая думка мае права на існаванне, галоўнае — яе аргументаваць. І вучні зусім не павінны думаць гэтаксама, як іх настаўнік. Так, у мяне больш жыццёвы вопыт, і я магу накіраваць іх пошукі ў пэўным напрамку, але ўсе маюць права на ўласнае меркаванне. Пры такім падыходзе дзеці смялей пачынаюць выказвацца, дзяліцца ідэямі, агучваць гіпотэзы...



Вольга ЖЫТКАЯ: «Дзякуючы актыўнай ацэнцы ты робішся больш цікавым для сваіх вучняў».

Ва ўсіх павінна быць упэўненасць, што любую іх думку адэкватна ўспрымуць як настаўнік, так і аднакласнікі. Я пераканалася, што актыўная ацэнка дапамагае вучню расці, галоўнай становіцца не адзнака, а ацэнка яго дзейнасці. Значэнне мае не тое, колькі балаў ты атрымаў на ўроку, а тое, чаму навучыўся. Мы ж вучымся не дзеля адзнак? Ва ўсялякім разе, так павінна быць! Актыўная ацэнка лечыць страх перад выстаўленнем адзнакі...

**Намеснік дырэктара сярэдняй школы № 5 г. Смаргоні настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Ларыса ВАЛЫНЕЦ** папярэджвае аб памылках пры забеспячэнні зваротнай сувязі: «Нельга выкарыстоўваць агульныя фразы накшталт «Цудоўна», «Ты малайца!» Зваротная сувязь павінна быць максімальна канкрэтнай і адрасаванай не 6 «А» класу, а Пецю, Васю, Алене і гэтак далей. Трэба паказваць вучню, што ў яго атрымліваецца, а над чым яшчэ трэба працаваць ці што трэба дапрацаваць, даць яму падказку, дзе знайсці патрэбны матэрыял (канкрэтную старонку параграфа, спасылку на інтэрнэт-рэсурс і гэтак далей). І пачынаць трэба са станоўчага: крытыка не павінна быць крыўднай. Безумоўна, забяспечыць зваротную сувязь складана фізічна, да таго ж рабіць гэта трэба не час ад часу, а сістэматычна. Затое ў адрозненне ад адзнакі ў балах **актыўная ацэнка — больш інфарматыўная, яна падказвае вучню, у якім напрамку яму рухацца далей, дазваляе эфектыўна матываваць выхаванцаў, прымушае іх браць на сябе адказнасць за сваё навучанне...** Прызнаюся, што для мяне самае складанае ў актыўнай ацэнцы — скласці цікавае ключавое пытанне і забяспечыць зваротную сувязь».

### ІНТРЫГА НА ЎРОКУ

— Дзякуючы актыўнай ацэнцы ты робішся больш цікавым для сваіх вучняў, — запэўнівае **настаўніца біялогіі Ушацкай сярэдняй школы Вольга ЖЫТКАЯ.** — А матываваць іх дапамагае якасна складзенае ключавое пытанне. На яго нельга адназначна адказаць «так» ці «не», яно павінна быць адкрытае. Гэта кручок, які не адпускае ўвагу дзіцяці 45 хвілін.

Пытанне павінна звязаць матэрыял, што будзе вывучацца, з жыццём. Каб вучні разумелі, як і дзе ім могуць спатрэбіцца тыя ці іншыя веды. Яно можа ахопліваць адзін урок ці ўвесь раздзел.

Вось некалькі прыкладаў ключавых пытанняў:

**«Чалавек і свет». 1 клас.**

*«Што больш страшна для дзікіх жывёл: холад ці голад?»*

**Руская мова. 3 клас. Тэма «Утварэнне слоў з дапамогай суфіксаў».**

*«Як пераўтварыць звычайнага ката ў маленькага ці вялізнага?»*

**Біялогія. 10 клас. Тэма «Манагібрыднае скрыжоўванне».**

*«Вы генетык-селекцыянер. Да вас звярнуўся ваш сябар — сабакавод-заводчык. Яму прапанавалі шчанюка хаскі за 400 рублёў, запэўніваючы, што той чыстакроўны. Які спосаб праверкі чыстакроўнасці сабакі вы можаце прапанаваць свайму сябру як генетык?»*

**Фізіка. 9 клас. Тэма ўроку «Рух па інерцыі. Першы закон Ньютона».**

*«Як вы лічыце, ці магчыма зрабіць так, каб цела рухалася бясконца?»*

— Можна ў якасці ключавога пытання скарыстацца дзвюма супрацьлеглымі думкамі, — прапануе Мікалай Запрудскі. — «Арыстоцель казаў: «Каб цела рухалася, трэба яго штурхаць...» А Ньютан сцвярджаў, што для таго, каб цела рухалася, трэба яму не перашкаджаць. Хто з іх меў рацыю?» Выдатна, калі ключавыя пытанні правакуюць дыскусію, ствараюць праблемную сітуацыю.

**Каментарый ад настаўніка (вусны і пісьмовы), а не адзнака ў балах, з'яўляецца фундаментам актыўнай ацэнкі.**

Ключавым пытаннем можа быць задача, загадка, гіпотэза, любы прадмет (скажам, цагліна на ўроку матэматыкі ці яблык — на ўроку гісторыі), малюнак, фота, калаж, плакат, відэаролік, лайфхак. Незвычайныя паводзіны настаўніка, калі ён стварае на ўроку пэўную сітуацыю, таксама могуць зачапіць увагу вучняў. Любяць дзеці і чорныя скрыні, якія захоўваюць інтрыгу. Калі ключавое пытанне добра прадумана педагогам загадзя, то на ўроку працуюць усе.

«На занятках у сёмым класе я паказваю навучэнцам разгорнутую далонь, пяро голуба, лісце клёна, каштана, дуба і задаю ім пытанне: «Што агульнага паміж гэтымі аб'ектамі і як яны дапамогуць нам сёння на ўроку?», — прыводзіць яшчэ адзін прыклад са сваёй практыкі Вольга Жыткая.

Цікавае назіранне: дзеці, якія да школы ахвотна распытваюць бацькоў і выхавальнікаў пра ўсё, што яны бачаць, страчваюць такую цікаўнасць у школе. Чаму? Магчыма, гэта вынік таго, што інфармацыю яны атрымліваюць раней, чым паспяваюць ёю зацікавіцца? Да таго ж педагог часцей за ўсё не пакідае ім часу на развагі і роздум. На пытанне «Як доўга чакаеце адказу?» большасць настаўнікаў прызнаецца, што некалькі секунд — да першай узнятай рукі.

**Прыхільнікі актыўнай ацэнкі называюць яе новай адукацыйнай філасофіяй. Чаму менавіта філасофіяй? Таму што АА патрабуе ад настаўніка прыняць новую ролю і адмовіцца ад стэрэатыпаў, якія склаліся ў традыцыйнай мадэлі. Настаўнік вучыць не для таго, каб злавіць на памылках, а для таго, каб навучыць. Ён не кантралёр, а партнёр у працэсе навучання. У цэнтры ўрока знаходзіцца вучань з яго патрэбамі.**

Для педагога актыўная ацэнка — шлях да змен: як унутры сябе, так і навокал. Але любое развіццё — гэта ў пэўнай ступені выхад з зоны камфорту.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Падзея месяца

## Вялікая выстаўка аўтара, не прызнанага сваім часам

# «У НАС ЁН БЫЎ ТАКІ АДЗІН»





Разнастайнасць мастацкага «прадукту» распесціла нас так, што рэдка даводзіцца быць нечым сапраўды ўражаным, але ў Нацыянальным мастацкім музеі зараз можна знайсці нешта неверагоднае. Самы смелы беларускі мастак другой паловы XX стагоддзя, «новы Шагал» і папярэднік беларускага авангарда савецкага перыяду з унікальным стылем Ізраіль Басаў, які пры жыцці не паспеў ніводнай сваёй аўтарскай выстаўкі, зараз экспануецца ў маштабным праекце «Прамудрасць збудавала сабе дом». У залах музея размешчана каля шасцідзесяці графічных і жывапісных работ, частка з якіх паказваецца публіцы ўпершыню. З 15 жніўня яны займаюць прастору Нацыянальнага мастацкага музея, якая на месяц будзе прысвечана стагоддзю мастака.

**Сацрэалізм і афіцыйныя догмы — якіх трымаўся не толькі ЦК, але і самі мастакі — не змаглі прыняць татальна іншага Басава ў публічны творчы працэс.**

«Выстаўка пачынаецца з аўтапартрэта, за які самі калегі лаялі майго бацьку, — расказвае сын Ізраіля Басава, таксама мастак Мацвей Басаў. — Маўляў, чаму ты рот так крыва намаляваў. Нехта разумеў, што гэта робіцца для экспрэсіі, абвастрэння, нехта, магчыма, зайздросціў, тут шмат нюансаў. Час такі быў — партрэт быў напісаны ў 1964 годзе, — калі яму даставалася ад калег».

Ізраіль Басаў стаяў асобна ад мастацкай тусоўкі свайго часу. Сацрэалізм і афіцыйныя догмы — якіх трымаўся не толькі ЦК, але і самі мастакі — не змаглі прыняць татальна іншага Басава ў публічны творчы працэс. «Фармальная смеласць яго жывапісу, вызваленне ад сацыяльнай дыдактыкі сацрэалізму абумовілі вельмі скупы выставачны лёс і адсутнасць персанальных выставак». Па словах Мацвея Басава, яго бацька вельмі з-за гэтага перажываў: «Яму не давалі выстаўляцца, таму што ён быў зусім іншы, лічылі, што на яго творчасць уплывае Захад, хоць у Маскве такога кшталту мастакі выстаўляліся свабодна. А ў нас ён быў такі адзін, што і стала праблемай».

У выніку ж, нягледзячы на такую «непапулярную» фармальную пазіцыю ў мастацкім асяроддзі пры жыцці, Ізраіль Басаў прызнаны адным з самых выдатных майстроў беларускай гісторыі мастацтва, які хоць і не быў прызнаны сваім часам, але настойліва трымаўся ўласнага стылю насуперак канонам сацрэалізму.

«Адкрыццё гэтай выстаўкі — безумоўна, свята, праўда, са слязьмі на вачах, таму што Ізраіль Басаў ніколі не бачыў свае работы ў такім храме і не станавіўся галоўным персанажам такой падзеі, — адзначыла мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн на цырымоніі адкрыцця. — Ён быў папярэднікам беларускага авангарда 1970-х, якім мы яго ведаем і любім, вытокам, пачаткам, цудоўным чалавекам неверагоднага маштабу. Малога росту, маленькі ў сваіх людскіх патрэбах, ён быў глыбай у мастацтве. У сваім жывапісе Басаў не баяўся нічога, ён быў шалёна смелы, чым палохаў іншых. Яго работы былі зусім не ідэалагічныя, яны не адпавядалі запытам дзяржавы ці часу, але адпавядалі запытам вечнасці».

Назва выстаўкі — выраз з прытчы «Прамудрасць збудавала сабе дом» — апроч таго, што адсылае да жыцця мастака, паказвае і змест экспазіцыі. Дом, які ў Басава апроч сваёй прыкладной функцыі становіцца яшчэ і філасофскім сімвалам, тут з'яўляецца лейтматывам. У выстаўцы шмат Мінска, любоўю да якога мастак вядомы. «Пра Мінск увогуле можна рабіць асобную выстаўку. Гэты жывапіс трэба паказваць, таму што моладзь мае дастаткова нядобрых прыкладаў і страчвае свае здольнасці, а малады аўтар павінен цягнуцца да сапраўднага, некамерцыйнага мастацтва», — кажа Мацвей Басаў.

**Графічныя і жывапісныя творы — аснову выстаўкі — дапаўняюць фотаздымкі і дакументы, а таксама відэанарыс пра Ізраіля Басава.**

У адной з залаў прадстаўлена цэлая кампазіцыя графічных малюнкаў, якія не паказваліся дагэтуль. Сярод карцін можна знайсці работу «Успамін»: «Алена Аладава ўбачыла яе на нейкай выстаўцы і адразу купіла, за невялікую цану, яна не магла шмат заплаціць, але карціна захавалася ў музеі. Аладава вельмі любіла і шанавала майго бацьку». Графічныя і жывапісныя творы — аснову выстаўкі — дапаўняюць фотаздымкі і дакументы, а таксама відэанарыс пра Ізраіля Басава.

«Прамудрасць збудавала сабе дом» сфарміраваная з фондаў Нацынальнага мастацкага музея, Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, фонду Беларускага саюза мастакоў, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і ўласна калекцыі сям'і мастака. Ізраіль Басаў будзе выстаўляцца ў музеі да 16 верасня.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

■ На адкрытай прасторы

# СЁННЯШНІ ВЕЧАР КЛАСІКІ КАЛЯ РАТУШЫ РОБЯЦЬ БЕЛАРУСЫ СВЕТУ

**Класічная музыка працягвае панаваць у суботнім Верхнім горадзе. Сёння праект «Класіка каля Ратушы з velcom» загучыць Бахам, Вівальдзі, Шасонам, Глінкам, Шастаковічам у выкананні беларускіх музыкантаў, што атрымалі шырокую вядомасць у свеце.**

Сусветна вядомыя беларусы, што жывуць і працуюць за межамі нашай краіны, зробяць шосты канцэрт «Класікі каля Ратушы». Кіравацью музыкантамі будзе дырыжор і піяніст Цімур Сергеення з 35-летнім стажам, які паўдзельнічаў у больш чым дзвюх тысячах канцэртаў па ўсім свеце: у Нідэрландах, Манака, Францыі, Германіі, Італіі, Даніі і іншых краінах.

Ён жа сядзе за інструмент і выканае Глінкаў «Бліскучы дывертысмент» на матывы оперы Беліні «Самнамбула». Апроч Цімура Сергеені, на галоўнай сцэне выступяць вядомыя скрыпачы Лілія Умнава, Ксенія Бельцюкова, Вікторыя Бабенка, Людміла Гарбуз, Настасся Карызна і Ігар Салаенка.

Гэты канцэрт стане перадапошнім у серыі выступленняў у межах праекта «Класіка каля Ратушы з velcom». Як звычайна, уваход — пачатак прыходзіцца на палову дзявятай вечара — вольны. Арганізатарамі выступаюць Мінгарвыканкам і «Мінскканцэрт» пры генеральнай падтрымцы кампаніі velcom.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■ Кінакрокі

# «ХРУСТАЛЬ»

## Нашумелы фільм атрымлівае прызы і рыхтуецца да беларускай прэм'еры

**Карціна «Хрусталь» беларускі Дар'і Жук працягвае сваю фестывальную «кар'еру»: гэтым разам фільм атрымаў дзве ўзнагароды кінафоруму ў Выбаргу «Акно ў Еўропу». Калекцыю «Хрусталя» папоўнілі галоўны прыз у конкурсе «Капрадукцыя. Акно ў свет» і прыз Гільдыі кінаведаў і кінакрытыкаў.**

Яшчэ падчас выбаргскага фестывалю кінакрытыкі актыўна выказваліся наконт новай карціны з Беларусі. «У конкурсе капрадукцыі безумоўным лідарам мне падаецца фільм «Хрусталь» мінчанкі Дар'і Жук, якая жыве цяпер у ЗША, — напісаў небезвядомы Леанід Паўлючык. — Фільм Дар'і Жук не рэтра аб ліхіх 90-х, а выказванне аб сённяшнім і вечным. Аб сутыкненні мары і рэальнасці, аб дыктатуры побыту і прызе свабоды, аб духоўнай культуры і векавой сярэднявечнай дзікасці, што ўкаранілася ў жыццёвых порах».

■ На сцэне

# ВЫ ЗАВЯЗЛІ Ў МАТРЫЦЫ

## Купалаўскі ставіць Шэкспіра, а ў выніку абвяшчае маніфест

**Гэтым разам тэатр пачне новы сезон не з «Паўлінкі», а з «альтэрнатыўнага» спектакля па Шэкспіру «Сон у купальскую ноч», пастаўленага расійскім рэжысёрам Андрэем Прыкатэнкам. Дзень святога Іаана Хрысціцеля, да якога, мяркуецца, Уільям Шэкспір напісаў камедыю «Сон у летнюю ноч», у гэтым увасабленні п'есы ператварыўся ў, зразумела, свята Івана Купалы. Але героі засталіся ранейшыя — міфалагічныя асобы Робін, Абярон і Тытанія, маладыя афіняне Лізандр і Дзяметрый, Гермія і Алена. Спектакль, які ледзь не захлынаецца ад тэхналогій, падаўся не столькі творам мастацтва, колькі сімвалічным актам — праз змяненне шматгадовай традыцыі, Шэкспіра ў матрыцы сучаснага свету і пэўную эклектыку.**


Рэпетыцыя спектакля.

Лізандр і Гермія кахаюць адно аднаго, Дзяметрый кахае Гермію, Алена кахае Дзяметрыя, цар і царыца фей і эльфаў Абярон і Тытанія кахаюць адно аднаго, але лаюцца. Дарогі ўсіх персанажаў так ці інакш перасякаюцца ў начным лесе, дзе лясны дух Робін па загадзе Абярона ўмешваецца ў жыцці маладых людзей і выкарыстоўвае чарадзейнае зелле, здольнае прымусіць пакахаць іншага чалавека. Некалькі памылак эльфа — у рэальным жыцці таксама не кожны план такога роду «інтэрвентаў» спрацоўвае як трэба — становяцца нагодай для драматургічных перыпетый і шэрагу камічных у Шэкспіра і надрыўных у Прыкатэнкі сітуацый.

Калі адна з галоўных тэатральных пляцовак краіны, што з году ў год пачынае сезон з «Паўлінкі» Янкі Купалы, карэктуе ўласны звычай і знаходзіць замену нязменнай п'есе, яе рашэнне аўтаматычна ператвараецца ў пасыл (у гэтым выпадку як гледачам, так і тэатральнаму асяроддзю). «Сон у купальскую ноч» у якасці пастаноўкі, якая адкрывае сезон, куды больш змястоўны, чым «нетрадыцыйны спектакль моднага расійскага рэжысёра» сам па сабе, прычым складана і тонка змястоўны. У XX стагоддзі творчае асяроддзе перыядычна генеравала выдасканаленыя і пафасныя маніфесты, і мне падабаецца бачыць у новым спектаклі Купалаўскага — на тым месцы, якое ён зойме 8 верасня — вельмі ёмкую альтэрнатыву пісьмовым дэкларацыям.

**Чарадзейнае зелле, якім можна маніпуляваць такімі, здавалася б, непадуладнымі катэгорыямі, ужо не здаецца казачным элементам, а ператвараецца ў самы што ні ёсць рэальны інструмент уплыву.**

Трэба прызнаць, беларускі тэатр у цэлым пакуль што не ідзе ў нагу з агульнасусветнымі тэндэнцыямі і нават грашыць на пэўную архаічнасць: рэгулярна тут чуюцца развагі пра тое, чаго нам не хапае, хто ёсць прыклад і як падцягнуцца да наватарскага мыслення. Пакуль ён памаленьку сапраўды падцягваецца, вызначае сваё месца паміж «сталым» і «сучасным», застывае ў нерашучасці, Купалаўскі робіць заяву пра тое, што традыцыі — не заўсёды пазітыўная з'ява. І робіць гэтую заяву прыгожа, з цэлым шэрагам штрыхоў да характару сучаснага беларускага тэатра, якога, можна меркаваць, каманда Купалаўскага стане прытрымлівацца.

Запрашэнне рэжысёра Андрэя Прыкатэнкі, вядомага сваім некласічным прачытаннем класічных твораў, прыйшлося вельмі дарэчы. У першую чаргу таму, што ён задзейнічаў магчымасці тэатра і паставіў да перабору сучасны, у сэнсе тэхналагічны, спектакль. Настолькі сучасны, што яго сучаснасць засланяе тэатральнае мастацтва само па сабе. У кантэксце сімвалічнасці «Сну ў купальскую ноч» гэтая празмернасць успрымаецца як іранічны прыём гіпербалы. Маўляў, мы не кажам, што будучыня тэатра за некананічнымі пастаноўкамі, але спрабуем агучыць, што БУДУЧЫНЯ ТЭАТРА ЗА НЕКАНАНІЧНЫМІ ПАСТАНОЎКАМІ. І не толькі гэта.

Дзеянне спектакля адбываецца ў асноўным у межах куба з галаграфічным пакрыццём, на якім перадаюцца радкі з камедыі Шэкспіра то на беларускай, то на англійскай, дзейныя асобы, быццам яны ў нейкай базе даных, і іншыя элементы відэапраекцыі, якія адсылаюць да матрыцы. Гледачы рассаджваюцца вакол куба, займаюць балкон і бельэтаж, з дапамогай чаго імітуецца, як усе кажуць, схема Калізея. Эльфы, што задзейнічаны ў якасці суправаджальнікаў Тытаніі (і сама царыца, часам і іншыя персанажы, але гэта няважна), перамяшчаюцца з дапамогай гіраскутараў. Затое калі яны аказваюцца прыгнечанымі Матавілам, у якога з-за чарадзейнага зелля закахалася Тытанія, «чароўная» сіла губляецца і эльфы застаюцца на нагах. І галоўнае: зелле — не што іншае, як фатаграфія на айфоне, на якім можна лёгка ажыццяўляць розныя маніпуляцыі з пачуццямі маладых герояў, што заблудзіліся ў лесе.

Увогуле, усё як у людзей: спектакль транслюе звычайную дыспазіцыю паміж істэблішментам (багі) і абывацелямі (маладыя афіняне) і спосаб, якім сёння першыя аказваюць уплыў на другіх. Мы такім чынам атрымліваем перасцярогу ў дачыненні да сучасных тэхналогій, якая ўжо даўно з'яўляецца распаўсюджаным матывам многіх твораў многіх відаў мастацтва.

Таму і шэкспіраўскі сон, як нейкі паралельны рэальнасці свет, тут становіцца матрыцай, у незлічоную колькасць лабірынтаў якой упісаны лёс, павароты і нават пачуцці сучасных людзей. Чарадзейнае зелле, якім можна маніпуляваць такімі, здавалася б, непадуладнымі катэгорыямі, ужо не здаецца казачным элементам, а ператвараецца ў самы што ні ёсць рэальны інструмент уплыву. Гэтая матрыца, у якую пастаноўка як бы змяшчае сучасныя рэаліі, і становіцца галоўным ідэйным элементам «Сну» і сэнсам, дзеля якога аўтары захапляюцца тэхналогіямі. Дзякуючы чаму ў пераваже над драматургіяй апошнія выглядаюць не празмернасцю, а зноў жа сімвалічным элементам.

**«Сон у купальскую ноч» у якасці пастаноўкі, якая адкрывае сезон, куды больш змястоўны, чым «нетрадыцыйны спектакль моднага расійскага рэжысёра» сам па сабе.**

Тое, як у сучасным спектаклі п'еса Шэкспіра, напісаная прыкладна паміж 1594 і 1596 гадамі, лёгка трансфармуецца ў актуальную пастаноўку, таксама служыць важным штрыхом да вызначэння новага тэатра: ён можа не проста выкарыстоўваць класіку, «вечную» саму па сабе, але з яе дапамогай перадаваць гледачу парадак бягучага дня.

Што яшчэ важнага можна ўзяць з соннага маніфеста, дык прэтэнзію на «эклектыку», дакладней, культурную калабарацыю. У гэтым выпадку сумяшчэнне хутчэй намінальнае, а таму яшчэ больш дэкларатыўнае: афіняне ў якасці галоўных герояў, брытанская і скандынаўская міфалогія, брытанскі драматург, расійскі рэжысёр, беларуская пляцоўка, дзень Іаана Хрысціцеля, свята Івана Купалы (толькі ў назве), рэп і беларускія музычныя матывы. Не перапляценне стыляў, але перапляценне кантактаў — натуральна, сусветны тэатр сёння жыве капрадукцыяй, да якой беларусам варта смялей далучацца.

Па-за межамі тэатральных пасылаў гарэзлівы Робін у выкананні Паўла Харланчука, суровы Аляксандр Казела ў ролі Абярона, чароўная Тытанія (Юлія Шпілеўская), выпіраючы Матавілаў палец у сандаліях, які разам са шкарпэткамі нацягнуў Міхаіл Зуй, істэрычныя разборкі чатырох маладых афінян, музыкальныя ўстаўкі, не зусім дарэчныя харэаграфічныя «стасункі» і іншае-іншае публіку захапілі. Гісторыя ў папулярнай форме — жанглюючы настроямі, з песнямі, танцамі і праекцыяй экрана айфона на сцены куба — расказвае, як катастрафічная сітуацыя прыходзіць да хэпі-энду. Каханне такім чынам запаноўвае ў кубе, праўда, калі ведаеш, што ў ход падзей умяшаліся пэўныя сілы, якія маюць аналагі ў рэальнасці, становіцца крыху не па сабе.

Тым не менш «Сон у купальскую ноч» — усё яшчэ глядацкая гісторыя, з аднаго боку. Сваёй новай прэм'ерай Купалаўскі дагаджае гледачу (калі выключным спектаклем у цэлым «Сон» не назавеш, для нашай прасторы гэта сапраўды не такі ўжо звычайны праект) і адначасова дэкларуе новыя правілы гульні, згодна з якімі традыцыйнасць у тэатры больш не выглядае козырам.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■

# АДЧЫНЯЕ АКНО Ў СВЕТ



Сусветная прэм'ера карціны адбылася на Міжнародным кінафестывалі ў Карлавых Варах, дзе яна адкрыла конкурс «З Усходу на Захад». Менавіта ў гэты час з'явілася інфармацыя пра тое, што «Хрусталь» рыхтуецца быць намінаваным ад Беларусі на Оскар у катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове», дзеля чаго нават быў узноўлены оскараўскі камітэт. Карціна атрымала Гран-пры міжнароднага кінафестывалю ў Адэсе і запрашэнні на больш за дваццаць кінафестываляў свету.

Нарэшце сталі вядомыя і падрабязнасці беларускай прэм'еры карціны: яна адбудзецца 29 жніўня ў кінатэатры «Масква», дзе фільм беларускай публіцы прадставіць рэжысёр Дар'я Жук, акцёры і члены здымачнай групы. З 30 жніўня «Хрусталь» выйдзе ў шырокі пракат у Мінску, а ў выніку ахопіць не толькі сталіцу, але і рэгіёны краіны.

Фільм расказвае пра постсавецкую моладзь і яе амерыканскую мару: маладая і яркая дзяўчына робіць памылку ў візе, рызыкуе страціць магчымасць паехаць у Амерыку і вымушана затрымлівацца ў правінцыйным індустрыяльным гарадку. Карціна паказвае «маладзёжныя падпольныя рэйвы, стыхійныя рынкі, мары маладых людзей пра эміграцыю і жыццё правінцыі, што застыла ў часе».

«Хрусталь» здымаўся ў нашай краіне пры ўдзеле кінакампаній Беларусі, ЗША, Германіі і Расіі, пракат карціны ажыццяўляе Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн».

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Искож», Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 57 |

**Предмет аукциона (одним лотом)** – оборудование, расположенное по адресу: Брестская обл., **г. Пинск, ул. Брестская, 57**

| Инв. № | Наименование |
|---|---|
| 2490 | **Универсальная линия по производству различных видов столовых клеенок, переплетного материала** (производитель: Forward Machinery Industrial Corporation (Тайвань, Китай) |
| 2377 | **Технологическая линия для производства ПВХ пленок различного назначения** (производитель: Wuxi Double Elephant Rubber & Plastics Machinery Co., Ltd (Китай) |

**Начальная цена с НДС 20 % – 6 675 921,18 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Обременение** | Находятся в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ» |
| **Условия аукциона** | Покупателю предоставляется право на заключение договора аренды площадей, на которых располагается оборудование, либо выкупа площадей, либо демонтаж линий за свой счет |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.09.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

В связи с поступившим в суд Ляховичского района заявлением о признании Ковалевского Владимира Владимировича, 5 августа 1977 года рождения, уроженца д. Савичи Слонимского района Гродненской области, последнее известное место жительства: г. Ляховичи Брестской области, ул. Строителей, д. 12, кв. 23, безвестно отсутствующим, просьба ко всем гражданам, что-либо знающим о местонахождении данного гражданина, сообщить об этом в течение двух месяцев со дня публикации в суд Ляховичского района, расположенный в г. Ляховичи Брестской области по ул. Первомайской, дом. 6.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Свирьагро» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания мастерских инв. № 633/С-10266 общей площадью 884,1 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624087408101000251 площадью 0,2982 га по адресу: Минская область, Мядельский район, Свирский с/с, д. Комарово, ул. Зеленая, д. 18Б (далее – Объект).** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона ручья № 28 (0,2982 га); придорожная полоса автомобильной дороги (0,2982 га); зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей (0,2982 га); охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В (0,0008 га).*

**Установлены типовые условия продажи объекта.**

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 19 488,00 бел. руб.** Стоимость снижена на **20 %.**

**Задаток 10 % от начальной цены (1 948,00 бел. руб.) перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Нива» от 07.12.2017. Аукцион состоится **29.08.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.08.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 19 сентября 2018 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объектов недвижимости, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельдрев» на праве собственности

| № лота | Наименование объекта, его место нахождения | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание столовой, **инв. № 322/С-20819.** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Заречная, 115А | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное кирпичное строение, 1999 года постройки. Общая площадь – 216,0 кв. м | 30 800,19 | 3 080,00 |
| | Здание материального склада, **инв. № 322/С-24347.** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Заречная, 115А/1 | Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное строение, 1992 года постройки. Общая площадь – 63,3 кв. м | | |

**Земельный участок** для обслуживания зданий на праве постоянного пользования площадью **0,2725 га** с кадастровым номером 324750100001003167. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов – водоохранная зона р. Днепр, площадь – 0,2725 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 18 сентября 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **19 сентября 2018 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 18 августа 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов

